# Раздзел I. ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЫТАННІ РАЗВІЦЦЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ І КНІЖНАЙ СПРАВЫ БЕЛАРУСІ

***Кузьмініч Таццяна Васільеўна***
Нацыянальная бібліятэка Беларусі
***Саітава Валянціна Іванаўна***
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ БІБЛІЯГРАФІІ: СУЧАСНЫ ЭТАП (1990–2010-я гг.)

Беларуская бібліяграфія ў шэрагу іншых бібліяграфічных утварэнняў паводле тэрытарыяльна-дзяржаўнай, моўнай і нацыянальнай прымет скіравана на пазнанне дакумента ці яго кожнай структурнай адзінкі як фрагмента рэчаіснасці, распазнаванне і пошук інфармацыі ў любым тэкставым масіве, магчымасць камунікацыі паміж аўтарам дакумента і яго патэнцыяльным карыстальнікам. Яна забяспечвае бібліяграфічнае мадэляванне дакументаў (тэкстаў) – дакументных патокаў – і з'яўляецца адным са сродкаў захавання гісторыка-культурнай памяці грамадства. Нягледзячы на інфраструктурнасць бібліяграфіі і яе транснацыянальныя задачы, захоўвае выразныя нацыянальныя характарыстыкі, якія праяўляюцца праз магчымасць бібліяграфічных сродкаў прадстаўляць нацыянальныя аб'екты і іх любыя сукупнасці, адлюстроўваць спецыфіку нацыянальнай дакументнай спадчыны. Гэта складаная грамадская з'ява, цесна звязаная з узроўнем адукацыі, навуковага і культурнага развіцця грамадства, абумоўленая сацыяльна-палітычнымі, эканамічнымі і іншымі фактарамі.

На кожным гістарычным этапе беларуская бібліяграфія развівалася як у кантэксце сусветнай бібліяграфіі, так і пад уплывам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівасцей нацыянальнай гісторыі, культуры, адукацыйных і навуковых сістэм, а таксама гісторыі і культуры краін і дзяржаўных утварэнняў, часткай якіх станавіліся беларускія землі. Таму невыпадковы і цікавасць да яе як грамадскай з'явы, і вялікае кола публікацый, дзе асэнсоўваецца яе значэнне, падагульняецца пэўны бібліяграфічны вопыт. Пытанні гісторыі беларускай бібліяграфіі разглядаліся ў асобных дысертацыях, манаграфіях, вучэбных выданнях, а таксама ў шэрагу артыкулаў, прысвечаных асобным складаючым [1]. Тым не менш сучасны этап развіцця беларускай бібліяграфіі, які пачынаецца, на нашу думку, з 1990-х гг., у літаратуры мала асветлены [2]. У гэтым артыкуле зроблена спроба абагульнення сучасных асноўных уласна бібліяграфічных з'яў (развіццё арганізацыйных структур, асобных відаў бібліяграфіі, а таксама аналіз фактараў уздзеяння на развіццё бібліяграфіі і вызначэнне кірункаў узмацнення яе ролі ў грамадстве).

Беларуская бібліяграфія ў пачатку 1990-х гг. перайшла на якасна новы ўзровень. Згодна з перыядызацыяй менавіта з гэтага часу пачынаецца сучасны этап яе развіцця [3]. Гэта абумоўлена наступнымі фактарамі: Беларусь стала незалежнай дзяржавай і атрымала магчымасць развіваць нацыянальныя арганізацыйныя структуры, у тым ліку бібліяграфічныя; у грамадскім жыцці пачаліся дэмакратычныя перабудаванні; у эканамічным жыцці краіны стаў здзяйсняцца пераход да рынкавых адносін; у розныя сферы жыццядзейнасці грамадства ў цэлым пачалі ўкараняцца камп'ютарныя тэхналогіі.

Працэсы дэмакратызацыі грамадскага жыцця краіны істотна паўплывалі на розныя кірункі бібліяграфічнай дзейнасці. Галоўны ў савецкі час прынцып камуністычнай партыйнасці страціў сваё значэнне для беларускай бібліяграфіі ў цэлым. Пачалі дамінаваць прынцыпы плюралізму, свабоды доступу да інфармацыі, а таксама ідэалагічныя прыярытэты, характэрныя для незалежнай дзяржавы [4]. Найбольш выразна гэта праявілася ў методыцы бібліяграфавання, у складзе і змесце бібліяграфічнай прадукцыі.

Пачалася работа па стварэнні нарматыўна-прававой базы дзейнасці грамадскіх інстытутаў сістэмы дакументных камунікацый як устаноў незалежнай краіны. Былі прыняты новыя законы, пастановы і іншыя нарматыўныя дакументы, нацыянальныя, дзяр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жаўныя праграмы, канцэпцыі, якія вызначылі прававыя, эканамічныя, сацыяльныя, арганізацыйныя асновы развіцця розных сфер інфармацыйнай дзейнасці, у тым ліку і бібліяграфічнай. На базе арганізацый, што існавалі раней, створаны або пераўтвораны ўстановы нацыянальнага ўзроўню – Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ), Нацыянальная кніжная палата (НКП), Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі (НЦПІ), Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці (НЦІУ), Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы (БелІСА) і некаторыя іншыя. За імі былі замацаваны функцыі па дзяржаўнай рэгістрацыі асобных відаў дакументаў (афіцыйных, навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных работ, патэнтаў, электронных інфармацыйных рэсурсаў (ЭІР) і інш.). Таксама гэтыя ўстановы павінны былі стварыць адпаведныя інфармацыйныя рэсурсы.

З пачатку 1990-х гг. атрымалі новы імпульс у развіцці беларусазнаўчая, краязнаўчая і нацыянальная віды бібліяграфіі, а таксама нацыянальная сістэма навуковай і адукацыйнай дзейнасці ў галіне бібліяграфіі. Беларуская бібліяграфія стала асвойваць якасна новую тэматыку стварэння бібліяграфічнай прадукцыі – знешняя палітыка, знешнеэканамічная і знешнефінансавая дзейнасць, валютныя аперацыі і інш. Кардынальна змянілася стаўленне да бібліяграфічнай дзейнасці беларусаў замежжа. Яе сталі разглядаць у кантэксце агульнага развіцця беларускай бібліяграфіі як неад'емны кампанент агульнанацыянальнай бібліяграфічнай спадчыны.

Узмацніліся таксама непасрэдныя кантакты беларускіх спецыялістаў з замежнымі калегамі, парытэтны характар набыў удзел у міжнародных прафесійных зносінах. Беларускія спецыялісты сталі прымаць удзел у рэалізацыі міжнародных праектаў і рабоце міжнародных арганізацый, аб'ектам увагі якіх (у ліку іншых) былі пытанні развіцця бібліяграфічнай дзейнасці.

Развіццё рынкавых адносін у краіне спрыяла ўзнікненню платных бібліяграфічных паслуг як з'явы ў дзейнасці бібліятэк, архіваў, а таксама варыятыўнасці ўстаноў па фарміраванні іх асартыменту. Акрамя таго, значна скарацілася колькасць друкаванай бібліяграфічнай прадукцыі, якая ў параўнанні з электроннай стала больш працазатратнай і эканамічна менш эфектыўнай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распаўсюджванне камп'ютарных тэхналогій у дзейнасці розных установ інфармацыйнай сферы закранула, перш за ўсё, бібліяграфічныя працэсы. Былі пастаўлены задачы стварэння рэспубліканскай аўтаматызаванай бібліятэчна-інфармацыйнай сістэмы, сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі і вядзення зводнага электроннага каталога (ЗЭК) бібліятэк Беларусі. З пачатку 1990-х гг. пачалося шырокае ўкараненне аўтаматызаваных інфармацыйна-пошукавых сістэм у дзейнасць бібліятэк, архіваў, генерыраванне імі ўнікальных баз даных (БД) і іншай электроннай інфармацыйнай прадукцыі, распрацаваны нацыянальныя камунікатыўныя фарматы BELMARC для бібліяграфічных і аўтарытэтных запісаў [5]. Бібліяграфічная прадукцыя бібліятэк стала арыентавацца на міжнародныя стандарты прадстаўлення запісаў і інтэграванне ў сусветную інфармацыйную прастору. У дзейнасці бібліятэк пачалі актыўна выкарыстоўвацца віртуальныя даведачныя службы і сэрвісы розных сусветных вытворцаў інфармацыйных рэсурсаў, а таксама стварацца ўласныя.

Упершыню ў бібліяграфічнай дзейнасці Беларусі стала прымаць актыўны ўдзел грамадская арганізацыя «Беларуская бібліятэчная асацыяцыя» (ББА), у структуры якой былі створаны камітэты бібліяграфічнага кірунку, затым – беларускія кансорцыумы BelLibNet, LibКАРД, БелАР, а таксама Савет бібліятэк Беларусі па інфармацыйным узаемадзеянні [6].

У гэты перыяд значна ўзбагаціўся навукова-адукацыйны патэнцыял беларускай бібліяграфіі. Упершыню ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў быў арганізаваны спецыялізаваны савет па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, пачала функцыянаваць магістратура. Актывізаваўся выпуск айчынных вучэбных дапаможнікаў, слоўнікаў і іншых прац, прысвечаных арганізацыйным, тэарэтычным, гістарычным і тэхналагічным аспектам развіцця айчыннай бібліяграфіі. Сталі стварацца вучэбныя праграмы (у тым ліку і тыпавыя) і вучэбна-метадычныя комплексы для падрыхтоўкі на нацыянальнай глебе бібліятэкараў-бібліёграфаў, спецыялістаў для рэдакцыйна-выдавецкай і архіўнай дзейнасці, справаводства.

Па сутнасці, у развіцці ўсіх відаў бібліяграфіі адбыліся істотныя змены, у тым ліку і ў такіх стабільных, як бягучая нацыяналь-

ная (дзяржаўная), нацыянальная рэтраспектыўная і каталожная. Змяненні метадалагічных падыходаў, тэхнічныя і тэхналагічныя інавацыі далі магчымасць дасягнуць большай паўнаты адлюстравання бягучага і рэтраспектыўнага дакументнага патоку, створанага ў Беларусі, і дакументаў экстэрыёрыкі, аб'яднаць намаганні розных інфармацыйных устаноў, палепшыць якасць адлюстравання дакументнага патоку і дасягнуць значнай варыятыўнасці ў яго выкарыстанні.

Укараненне камп'ютарных тэхналогій, а разам з імі і аўтаматызаваных інфармацыйна-пошукавых сістэм у бібліятэчную практыку спрыяла кардынальнаму змяненню каталагізацыйных працэсаў і стварэнню новай формы каталожнай прадукцыі – электронных каталогаў, у межах якіх стала магчымым аб'яднанне вынікаў работы з дакументам на розных этапах яго бібліяграфічнага адлюстравання і больш эфектыўнае (у параўнанні з папяровымі тэхналогіямі) выкарыстанне атрыманай інфармацыі. Электронныя каталогі з пачатку 1990-х гг. увайшлі ў практыку большасці бібліятэк, архіўных устаноў. На пачатку яны мелі лакальны характар і адлюстроўвалі толькі вынікі апрацоўкі бягучага дакументнага патоку, затым у буйных бібліятэках пачалі здзяйсняцца працэсы рэкаталагізацыі, рэтраканверсіі і стварэння імідж-каталога (у НББ), а таксама склаліся ўмовы для карпаратыўнай каталагізацыі і вядзення ЗЭК. Самымі маштабнымі каталагізацыйнымі праектамі ў нашай краіне з'яўляюцца рэалізацыя сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі (СКК) і вядзенне ЗЭК бібліятэк Беларусі, стварэнне і падтрымка Нацыянальнай базы даных аўтарытэтных запісаў [7].

Удзельнікамі СКК у цяперашні час з'яўляюцца чатыры бібліятэкі нашай краіны: НББ, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі), Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка (РНТБ), Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь, якія атрымліваюць абавязковы бясплатны экзэмпляр нацыянальных выданняў і захоўваюць асноўны блок замежнай дакументнай прадукцыі, што набываецца бібліятэкамі краіны. Каталагізацыя здзяйсняецца ў адзіных фарматах прадстаўлення бібліяграфічных і аўтарытэтных запісаў (BELMARC) па адзіных (альбо адаптаваных) метадычных кіраўніцтвах. Агульныя аб'ёмы запісаў на першую палову 2016 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дасягнулі 7,3 млн (каля 5,2 млн бібліяграфічных, больш за 2 млн аўтарытэтных). Адлюстраваны кнігі, выяўленчыя, картаграфічныя дакументы, ноты, аўдыя- і відэадакументы, перыядычныя выданні і інш. Папаўненне ЗЭК здзяйсняецца ў выніку каталагізацыі дакументнага патоку, які паступае ў бібліятэкі (без абмежаванняў па колькасці запісаў, што імпартуюцца і экспартуюцца), а таксама шляхам пакетнай загрузкі раней створаных (напрыклад, у выніку рэтраканверсіі) масіваў. Аўтарытэтныя запісы ствараюцца ў рэжыме бягучай каталагізацыі на ўсе ўстаноўленыя фарматам BELMARC энтытэты (з максімальнай паўнатой прадстаўляюцца нацыянальныя аб'екты). Імпартаванне запісаў з ЗЭК здзяйсняюць не толькі ўдзельнікі СКК, але і іншыя бібліятэкі краіны. Распрацавана тыпавое праграмнае забеспячэнне для рэгіянальных зводных электронных каталогаў (РЗЭК) і створаны РЗЭК бібліятэк Гомельскай і Гродзенскай абласцей, а таксама праграмныя сродкі размеркаванай пошукавай сістэмы ЗЭК на базе пратакола Z 39/50 для бібліятэк, што не працуюць у фармаце BELMARC. Таму патэнцыяльнымі пастаўшчыкамі інфармацыі ў ЗЭК з'яўляюцца любыя бібліятэкі краіны, якія маюць у складзе сваіх аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (АБІС) сервер Z 39/50.

Цэнтралізацыя каталагізацыйных працэсаў абумоўлена выкарыстаннем адзіных лінгвістычных сродкаў і прымяненнем аднатыпных (падобных, узгодненых) метадычных рашэнняў. Толькі ў такім выпадку ў поўнай ступені рэалізуюцца магчымасці СКК і ЗЭК. У рамках развіцця пошукавых магчымасцей ЗЭК (прадстаўленне карыстальнікам у зручнай форме класіфікацыйнай інфармацыйна-пошукавай мовы – УДК), фарміравання адзінай нацыянальнай класіфікацыйнай мовы распрацавана першая чарга БД УДК і зроблены навуковы пераклад табліц УДК на беларускую мову. Прамоцыя гэтай міжнароднай класіфікацыйнай сістэмы на нацыянальную глебу дазволіць не толькі аптымізаваць каталагізацыйныя працэсы ў краіне, але і прапанаваць альтэрнатыву Тыпавой схеме класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь, якая была распрацавана ў пачатку 1990-х гг. і ўжо не дазваляе адлюстраваць усю сучасную шматграннасць краязнаўчага дакументнага патоку (яе немагчыма і немэтазгодна развіваць). Выкарыстанне ўсімі бібліятэкамі краіны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК як адзінай класіфікацыйнай сістэмы зробіць магчымым здзяйсняць яе метадычнае і тэхналагічнае суправаджэнне на карпаратыўнай аснове, а таксама плённа ўдзельнічаць у рабоце міжнароднага прафесійнага супольніцтва. Усё гэта дазволіць фарміраваць дастаткова мабільны бібліяграфічны рэсурс і карпаратыўны сэрвіс, які забяспечыць аператыўнасць стварэння бібліяграфічных і аўтарытэтных запісаў на назапашаныя дакументныя масівы і дасць карыстальніку магчымасць правядзення якаснага інфармацыйнага пошуку.

Бібліятэкамі Беларусі здзяйсняецца на карпаратыўнай аснове аналітычны роспіс айчынных і замежных часопісаў, што паступаюць у іх фонды, і ствараецца рэсурс «Сводный электронный каталог статей LibКАРД» [8]. У гэтым праекце ўдзельнічаюць 14 каталагізуючых устаноў краіны. Ён дазваляе мінімізаваць дзейнасць па стварэнні запісаў у межах асобнай установы і разам з тым аптымізаваць папаўненне лакальных каталогаў, забяспечвае магчымасць пошуку ў аб'яднаным рэсурсе. На жаль, адсутнічае сувязь з ЗЭК бібліятэк Беларусі, што істотна абмяжоўвае/ускладняе інфармацыйна-пошукавую дзейнасць карыстальнікаў.

Перспектывы развіцця ЗЭК бібліятэк Беларусі звязаны і з прадстаўленнем аналітычных запісаў.

У Беларусі, як і ў іншых краінах свету, назіраецца тэндэнцыя інтэграцыі каталожнай і нацыянальнай бібліяграфіі. Так, у электронным каталозе НББ рэгіструюцца ўсе віды друкаванай нацыянальнай прадукцыі, электронныя выданні і дысертацыі, у электронным каталозе РНТБ – спецвіды тэхнічных дакументаў (прамысловыя каталогі і інш.). Гэта больш шырокі пласт нацыянальных дакументаў у параўнанні з адлюстраваннем іх у дзяржаўных бібліяграфічных дапаможніках. Таму лакальныя каталогі буйных бібліятэк Беларусі, ЗЭК бібліятэк Беларусі (з магчымасцю пошуку дакументаў па прымеце «нацыянальныя») выконваюць функцыі бягучай і рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі.

З сярэдзіны 1990-х гг. у Беларусі быў рэалізаваны шэраг праектаў, скіраваных на фарміраванне якаснага метаінфармацыйнага ўзроўню адлюстравання нацыянальнай дакументнай спадчыны. Гэта стварэнне (працяг раней заяўленых, перавыданне найбольш буйных, падрыхтоўка якасна новых) дзяржаўных і рэперту-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

арных бібліяграфічных паказальнікаў, адлюстраванне НКП рэтраспектыўнага масіву запісаў з крыніц дзяржаўнай бібліяграфіі ў электроннай форме, распрацоўка Праграмы развіцця нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, фарміраванне зводнага электроннага інфармацыйнага рэсурсу нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі (выкананне задання № 21 Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг.) і інш.

Вядучая роля ў стварэнні бягучай нацыянальнай бібліяграфіі належыць НКП, якая правяла значную работу па дасягненні адпаведнасці бібліяграфічных дапаможнікаў, што ствараюцца, патрабаванням Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў (ІФЛА) па ўніверсальным бібліяграфічным уліку. З 1993 г. яна з'яўляецца Нацыянальным агенцтвам па стандартнай нумарацыі кніг (ISBN) [9].

У наш час НКП працягвае стварэнне распачатай яшчэ ў 1924 г. серыі дзяржаўных бібліяграфічных паказальнікаў «Летапіс друку Беларусі». З пачатку 1990-х гг. адбылася яе аптымізацыя, летапісы сталі выдавацца асобнымі відавымі выпускамі, у ліку іншых (напрыклад, «Кніжны летапіс», які выходзіць з 1924 г.) узніклі новыя – «Летапіс картаграфічных выданняў» (1995) і «Летапіс аўтарэфератаў дысертацый» (1999). Летапіс экстэрыёрыкі пачаў называцца «Беларусь у сусветным друку», у ім упершыню сталі адлюстроўвацца публікацыі замежных краін, незалежна ад іх грамадска-палітычнага ладу. Змянілася структура выпускаў – пачалі прымяняць групоўку бібліяграфічных запісаў і індэксаванне кніг па УДК (1993), што з'явілася адметным фактам прызнання міжнародных рэкамендацый па нацыянальнай бібліяграфіі. Штогод выпускаюцца кумулятыўны паказальнік «Кнігі Беларусі» і «Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі».

Вышэйназваную серыю дапаўняе бібліяграфічная прадукцыя па адлюстраванні спецвідаў дакументаў Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС), НЦПІ, НЦІУ, Навукова-інжэнернага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут прыкладных праграмных сістэм» (НІРУП ІППС), БелІСА, прысвечаная інфармаванню аб нарматыўных, патэнтных і неапублікаваных работах, а таксама адпаведныя БД. Напрыклад, з 1997 г. БелІСА распачаў выпуск «Бюллетеня реги-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

страции НИР, ОКР, ОТР», НІРУП ІППС з 2003 г. – «Каталога электронных ресурсов». Нацыянальныя нарматыўныя акты па стандартызацыі адлюстроўваюцца ў інфармацыйна-пошукавай сістэме «Стандарт» (БелДІСС).

На сённяшні дзень НКП як вядучая ўстанова па здзяйсненні бягучай нацыянальнай бібліяграфіі ў краіне падтрымлівае цесныя сувязі з бібліятэкамі і іншымі інфармацыйнымі ўстановамі, абменьваецца з зацікаўленымі бягучай інфармацыяй аб выданнях, але, на жаль, у сістэме карпаратыўнай каталагізацыі бібліятэк Беларусі не ўдзельнічае, і таму сёння ў межах краіны нельга гаварыць аб рэалізацыі аднаразовай бібліяграфічнай апрацоўкі дакументаў і стварэнні эталонных запісаў на бягучы дакументны паток.

Дасягненні ў развіцці рэпертуарнай бібліяграфіі нашага часу сталі магчымы дзякуючы кардынальным зменам светапогляднага характару ў параўнанні з савецкім часам. Незалежнасць дзяржавы спрыяла імкненню ідэнтыфікаваць нацыянальныя аб'екты і адлюстраваць іх у гістарычным ракурсе. На сучасных навуковых асновах былі абгрунтаваны паняцці «нацыянальны дакумент», «беларускі друк» і інш. [10]. Завяршыўся на тэарэтычным узроўні вельмі складаны працэс ідэнтыфікацыі беларускага друку на працягу яго існавання як з'явы мультыэтнічнай, шматмоўнай і рознашрыфтавой. Новыя падыходы істотна пашырылі кола нацыянальных аўтараў і дакументаў. Да ліку здабыткаў беларускай кніжнай культуры пачалі адносіць цэлыя пласты літаратуры, якую раней разглядалі як замежную, напрыклад польскамоўныя і іншыя выданні.

НКП і НББ ініцыявалі самыя буйныя нацыянальныя праекты ў галіне рэпертуарнай бібліяграфіі, іх намаганнямі створаны найбольш грунтоўныя адпаведныя бібліяграфічныя выданні. Разам з тым да фарміравання крыніц беларускай нацыянальнай бібліяграфіі далучаліся і іншыя ўстановы (напрыклад, Беларускі навукова-даследчы цэнтр дакументазнаўства, археаграфіі і архіўнай справы (БелНДІДАС)), якія таксама плённа працавалі ў гэтым рэчышчы. НКП працягнула падрыхтоўку рэтраспектыўных паказальнікаў па адлюстраванні нотна-музычнай літаратуры і перыёдыкі. Паказальнік «Музычная літаратура Беларусі, 1971–1990 гг.»

(1997) храналагічна дапоўніў папярэднія выпускі і ў сукупнасці з іншымі адлюстраваў адпаведны дакументны паток з 1917 па 1990 г.

Рэтраспектыўны бібліяграфічны ўлік перыядычных выданняў стымуляваўся надзвычай высокім попытам на матэрыялы з перыядычнага друку, які ўзнік у перыяд, што разглядаецца (на хвалі нацыянальнага адраджэння), у беларускай навуцы, адукацыі і грамадстве ў цэлым. У 1992 г. выйшаў «Летапіс часопісных артыкулаў» за 1928–1933 гг., які ліквідаваў прабел паміж рэтраспектыўным і бягучым бібліяграфічным улікам артыкулаў і ў якім былі адлюстраваны публікацыі шэрагу беларускіх вучоных, пісьменнікаў, дзяржаўных дзеячоў, імёны якіх па ідэалагічных прычынах былі выкраслены з нацыянальнай культурнай спадчыны. Выдатным дасягненнем беларускай нацыянальнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі стаў выпуск паказальніка «Газеты Беларусі. 1776–1975» (2003), дзе ўпершыню ўлічаны газеты ад пачатку іх з'яўлення на беларускіх землях (незалежна ад мовы іх выдання і палітыка-ідэалагічнага характару). У 2006 г. НББ на CD-ROMе быў перавыдадзены зводны каталог «Кніга Беларусі». За аснову ўзяты масіў запісаў друкаванага выдання, якое пабачыла свет у 1986 г. [11]. Ён выйшаў з дапаўненнямі, удакладненнямі, уключэннем ілюстрацыйнага матэрыялу і некалькіх паўнатэкставых копій, сістэмай гіперспасылак.

Лічбавае асяроддзе дазваляе інтэграваць бягучую і рэтраспектыўную часткі бібліяграфічнай інфармацыі, фарміраваць на аснове аднаго масіву разнастайныя відавыя і моўныя калекцыі, у тым ліку і нацыянальных дакументаў. Зразумела, што гэта вельмі «рухомыя» бібліяграфічныя зрэзы і яны нават з улікам маштабнасці фондаў гэтай установы не могуць замяніць паўнавартасную нацыянальную рэтраспектыўную бібліяграфічную прадукцыю.

Якасна новым рашэннем стала стварэнне ЭІР «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі». Былі распрацаваны яго канцэптуальныя, тэхналагічныя і навукова-метадычныя асновы («Дынамічная мадэль нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі», «Праграма развіцця нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі» і інш.) [12]. За аснову фарміравання кантэнту ўзяты комплексны прынцып, які прадугледжвае бібліяграфічны ўлік усіх відаў дакументаў, створаных як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі (моўны, аўтарскі, змястоўны

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аспекты). Зроблена праграмнае забеспячэнне для функцыянавання размеркаванай пошукавай сістэмы і вядзення зводнага ЭІР. Базавай арганізацыяй з'яўляецца НББ, на тэхнічных сродках якой размяшчаецца праграмнае забеспячэнне і якая фарміруе асноўны блок кантэнту. Рэгіянальнымі цэнтрамі фарміравання ЭІР з'яўляюцца абласныя бібліятэкі. Патэнцыяльнымі ўдзельнікамі сістэмы могуць стаць любыя бібліятэкі, калі працуюць у фармаце BELMARC і маюць у складзе сваіх АБІС сервер Z 39/50. У ёй рэалізаваны пошук інфармацыі аб нацыянальных дакументах па ЗЭК бібліятэк – удзельніц праекта (у тым ліку са зводнага электроннага каталога СКК і РЗЭК), а таксама і тых дакументаў, якія адсутнічаюць у фондах бібліятэк Беларусі і інфармацыя аб якіх зберагаецца ў цэнтральным вузле ЭІР «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі». У перспектыве гэты рэсурс будзе ўяўляць сабой максімальна поўнае бібліяграфічнае адлюстраванне як бягучай, так і рэтраспектыўнай частак нацыянальнай дакументнай спадчыны, у тым ліку і тых дакументаў, што зніклі ці сталі ўласнасцю іншых краін.

Развіццё беларускай навукова-дапаможнай бібліяграфіі на сучасным этапе адбываецца ў рэчышчы паскарэння і ўскладнення навуковых і адукацыйных працэсаў, удасканалення тэхналогій і тэхнікі. Акрамя вышэйпералічаных фактараў, характэрных для беларускай бібліяграфіі ў цэлым, на яе аказваюць істотны ўплыў і наступныя: 1) павышэнне значнасці метаінфармацыйнага ўзроўню як часткі інфармацыйнага забеспячэння даследчыкаў і спецыялістаў; 2) рэалізацыя неабмежаванага доступу вучоных да сусветных ЭІР і пашырэнне магчымасцей для іх публікацыйнай дзейнасці; 3) узмацненне на міжнародным узроўні дзейнасці буйных галіновых цэнтраў, карпарацый, выдавецтваў, іх інфармацыйнай актыўнасці.

Цэнтрамі беларускай навукова-дапаможнай бібліяграфіі з'яўляюцца буйныя бібліятэкі, навуковыя і навучальныя ўстановы краіны. Асноўныя кірункі іх дзейнасці звязаны з інфармацыйным забеспячэннем галін эканомікі, навукі, адукацыі і кіравання. Яно ахоплівае як стварэнне традыцыйных (папяровых) бібліяграфічных дапаможнікаў, так і падрыхтоўку рознага лічбавага кантэнту: бібліяграфічнага, фактаграфічнага, паўнатэкставага, а таксама любых варыянтаў іх спалучэння. Прычым арганізацыя яго выка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

БІБЛІЯТЭКА
Інв. № 347689

рыстання ідзе ў суаднясенні з магчымасцямі доступу беларускіх даследчыкаў, спецыялістаў, навучэнцаў да лепшых сусветных ліцэнзаваных БД, навуковых рэсурсаў адкрытага доступу, а таксама іх пошукавых і інфармацыйна-аналітычных механізмаў, якія актыўна задзейснены ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні, выбарачным распаўсюджванні інфармацыі і інш.

Бягучая бібліяграфічная інфармацыя навукова-дапаможнага характару (сігнальная, анатаваная, рэфератыўная) найбольш актыўна стваралася ў 1990-я гг. Гэта былі дапаможнікі па гісторыі, эканоміцы, праве, медыцыне, культуры і мастацтве (рэфератыўны зборнік «Беларусістыка», бібліяграфічныя паказальнікі «Грамадскія навукі», «Дзяржава і права», «Эканоміка Беларусі» і інш.). Паступова НББ і рэспубліканскія навуковыя бібліятэкі прыпынілі выданне некаторых галіновых бібліяграфічных паказальнікаў і пераўтварылі іх у БД. Так, НББ былі пераведзены ў электронную форму паказальнікі «Чарнобыль», «Новая літаратура па гісторыі і гістарычных навуках Беларусі»; ЦНБ НАН Беларусі – паказальнікі з працягам аб прыродных рэсурсах, «Навука і навукова-даследчая работа ў Беларусі». Цалкам адмовілася ад выпуску друкаваных паказальнікаў Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка (БелСГБ). Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь пачала выдаваць у папяровым і электронным выглядзе бібліяграфічныя паказальнікі «Дзяржава і права», «Літаратура па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання», «Парламенцкая дзейнасць: тэорыя і практыка».

Паступова (да 2000-х гг.) генерыраванне БД (лакальных і сеткавых) стала для бібліятэк краіны адным з асноўных кірункаў дзейнасці, вынікам якога з'яўляюцца адметныя інфармацыйныя рэсурсы. Напрыклад, НББ з 2007 г. стварае беларусазнаўчую БД «Беларусь: ад мінулага да сучаснасці», што аб'ядноўвае кантэнт распачатых у 1990-я гг. БД «Гісторыя Беларусі», «Культура і мастацтва Беларусі», «Чарнобыль» і сёння фарміруецца на аснове запісаў электроннага каталога бібліятэкі. РНТБ стварае БД «Инновационная деятельность», «Устойчивое развитие» і іншыя; ЦНБ НАН Беларусі – «Прырода Беларусі», «Навука і навукова-даследчая работа ў Беларусі», «Беларускае мовазнаўства», «Мовазнаўчая беларусістыка» і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З пачатку 2000-х гг. сталі актыўна ствараецца сеткавыя электронныя інфармацыйныя рэсурсы як універсальнага характару, так і галіновага: парталы, у тым ліку і галіновыя; персанальныя і тэматычныя вэб-сайты; вэб-сайты і парталы асобных устаноў, дзяржаўных структур, грамадскіх аб'яднанняў і інш. Іх бібліяграфічная складаючая выяўляецца праз пошукавыя механізмы (слоўныя і класіфікацыйныя – каталогі інтэрнэт-рэсурсаў), а таксама ў прадстаўленні галіновага, тэматычнага, персанальнага і іншага бібліяграфічнага кантэнту. Створаны шэраг беларускіх парталаў і вэб-сайтаў па прыродазнаўчых і дакладных навуках (біялогіі, фізіцы, матэматыцы, хіміі і інш.), машынабудаванні, медыцыне, сельскай гаспадарцы і іншых (напрыклад, парталы Аграweb Беларусь, Med.by і інш.) [13].

Вышэйназваныя і іншыя БД, што ствараюцца бібліятэкамі і інфармацыйнымі цэнтрамі нашай краіны, дазваляюць весці бягучы і рэтраспектыўны пошук інфармацыі. І таму яны часткова кампенсуюць функцыянальныя магчымасці рэтраспектыўнай бібліяграфічнай прадукцыі, выпуск якой у параўнанні з папярэднім гістарычным перыядам значна паменшыўся. Тым не менш у апошнія дзесяцігоддзі былі створаны значныя бібліяграфічныя паказальнікі, даведнікі, біябібліяграфічныя слоўнікі. Яны былі прысвечаны археалогіі Беларусі, археаграфіі, мовазнаўству, гісторыі адукацыі, медыцыне і інш. Напрыклад, «Археалогія Беларусі» (1997), «Исторические аспекты медицины и здравоохранения Беларуси» (1998), «Асвета і педагагічная думка ў Беларусі» (2001), «Беларускае мовазнаўства» (2005), «Археалогія Беларусі: каталог архіўных навуковых матэрыялаў (1924–2007)» (2009) і інш. Найбольш інтэнсіўна ствараецца бібліяграфічная прадукцыя, прысвечаная выдатным дзеячам навукі, адукацыі, літаратуры, спорту, выбітным дзеячам мінулага, ураджэнцам пэўных мясцовасцей, установам, – «История белорусской сельскохозяйственной академии (1836–1995)» (1996), «Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: біябібліяграфічны слоўнік» (2004), «Институт истории НАН Беларуси в лицах, 1929–2008: биобиблиографический справочник» (2008), «Выпускнікі і навучэнцы Магілёўскай мужчынскай гімназіі, 1809–2009: біябібліяграфічны даведнік» (2009);

а таксама выпускаюцца серыі «Библиография ученых НАН Беларусі», «Биобиблиография ученых Беларусі» і інш. [14].

Стварэнне друкаванай рэтраспектыўнай бібліяграфічнай прадукцыі абумоўлена значнасцю і часам яе незаменнасцю для падагульнення развіцця розных навуковых кірункаў, асабліва біяграфістыкі. Яна спрыяе таксама вызначэнню «кропак росту» тэматычнай разнастайнасці і дасягненняў айчыннай навукі, адукацыі, вытворчасці. У падрыхтоўцы такіх бібліяграфічных прац прымаюць удзел як бібліятэкі, так і навуковыя інстытуты, вышэйшыя навучальныя ўстановы (напрыклад, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, БелНДІДАС, Нацыянальны інстытут адукацыі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (БДУ) і інш.).

На сучасным этапе новыя вектары развіцця набыло бягучае бібліяграфічнае інфармаванне. Рэалізаваны перавагі лічбавага асяроддзя, звязаныя з магчымасцямі імгненна адпраўляць карыстальніку інфармацыю (бібліяграфічную і паўнатэкставую), а таксама з павышэннем значнасці інфармацыйна-аналітычнай работы бібліёграфа ў надзвычай вялікіх аб'ёмах інфармацыі, даступнай праз разнастайныя сусветныя БД. Такую форму бягучага бібліяграфічнага абслугоўвання найбольш актыўна выкарыстоўвае БелСГБ.

Бібліятэкамі Беларусі ствараюцца і/ці выкарыстоўваюцца наступныя спецыяльныя сэрвісы: «Адкрытая інфармацыя», віртуальная даведачная служба «Спытай бібліятэкара», Віртуальная чытальная зала НББ, а таксама інтэграваныя пошукавыя механізмы і сэрвісы, прапанаваныя ў розных БД, да якіх бібліятэкі набываюць доступ. Для бібліяграфічнага абслугоўвання вучоных і спецыялістаў Беларусі акрамя выданняў і БД уласнай генерацыі шырока выкарыстоўваюцца электронныя рэсурсы і сэрвісы сусветна вядомых кампаній (EastView, EBSCO, Elsevier, ProQuest, Springer Nature, Thomson Reuters, Навуковая электронная бібліятэка і інш.), доступ да якіх магчымы праз індывідуальную падпіску і карпаратыўна (праз Віртуальную чытальную залу НББ). Гэта якасна змяніла бібліяграфічнае абслугоўванне і дало дадатковыя магчымасці для бібліяграфічнага самаабслугоўвання.

Для айчынных навуковых бібліятэк актуальным з'яўляецца таксама ўзмацненне бібліяметрычнага напрамку дзейнасці, удзел у прамоцыі навуковых публікацый даследчыкаў у сусветныя індэк-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сы навуковага цытавання. Нягледзячы на тое, што спажыванне такой інфармацыі з'яўляецца дастаткова новым кірункам для беларускай навуковай і адукацыйнай супольнасці, цікавасць да яе ўзрастае, і адпаведнай аналітычнай дзейнасцю пачынаюць займаюцца бібліятэкі, а таксама навуковыя аддзелы ВНУ (напрыклад, Навуковая бібліятэка Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта і Фундаментальная бібліятэка БДУ, бібліятэка Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, ЦНБ НАН Беларусі).

На працягу сучаснага перыяду адбыліся значныя змены ў беларускай рэкамендацыйнай бібліяграфіі – ад усплёску форм, тэматыкі, жанравай разнастайнасці ў 1990-я гг. да прыпынення цэлых кірункаў у 2000-я гг. Сёння можна адзначыць, што яна страціла свае лідзіруючыя пазіцыі ў параўнанні з папярэднім этапам свайго развіцця і набыла выразны рэгіянальны характар. Галіновыя рэспубліканскія бібліятэкі, па сутнасці, прыпынілі падрыхтоўку друкаванай рэкамендацыйнай бібліяграфічнай прадукцыі і не распачалі яе ў іншых формах. Значна скараціла сваю рэкамендацыйна-бібліяграфічную дзейнасць і НББ, якая доўгія часы ўзначальвала ў Беларусі гэты кірунак. Паменшылася колькасць і тыражнасць друкаванай прадукцыі, што выпускаецца. У пачатку 2000-х гг. спынена выданне бягучага бібліяграфічнага паказальніка «Беларуская мова, літаратура і мастацтва» – аднаго з самых цікавых і адметных па методыцы рэкамендацыйнага бібліяграфавання. Былі згорнуты таксама працы па падрыхтоўцы рэтраспектыўных рэкамендацыйных паказальнікаў. Разам з тым да сённяшняга часу бібліятэка выпускае бягучы бюлетэнь «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» (з 1960-х гг.). Ён мае даволі высокую тыражнасць на фоне сучаснай нацыянальнай друкаванай прадукцыі. Неаднаразова змянялася назва і структура бюлетэня. У дадатках да яго публікаваліся разнастайныя рэтраспектыўныя бібліяграфічныя спісы і агляды рэкамендацыйнага характару часам па тэмах, раней не распрацаваных у айчынным бібліяграфічным друку (анімастыка, гісторыя рэлігійнага жыцця, жанчыны ў гісторыі Беларусі, нацыянальныя супольнасці і інш.). З 1994 г. НББ пачала выпускаць паказальнік «Памятныя даты сусветнага календара», некалькі пазней былі асвоены магчымасці лічбавага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асяроддзя і сталі ствараццa анлайнавыя версіі гэтай і іншай прадукцыі, выпускацца CD.

Асноўны блок сучаснай айчыннай рэкамендацыйнай прадукцыі ствараецца абласнымі і раённымі бібліятэкамі. З пачатку 1990-х гг. у рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможніках пачалі адлюстроўвацца творы эмігрантаў, рэпрэсіраваных асоб і іншых аўтараў, забароненых у савецкі час. Істотна змянілася тэматыка рэкаменадацыйна-бібліяграфічных дапаможнікаў. Асноўнай у першай палове 1990-х гг. была тэма нацыянальнага адраджэння. А ўжо з другой паловы 1990-х гг. увага пачала засяроджвацца на сучасных маральна-этычных праблемах, мастацтве, народных традыцыях і інш. Пашырыўся відавы склад рэкамендацыйнай прадукцыі – календары знамянальных і памятных дат, персанальныя і тэматычныя дапаможнікі, віртуальныя выставы, прэзентацыі і праекты, арыентаваныя на папулярызацыю гісторыка-культурных, краязнаўчых ведаў. У большасці выпадкаў гэта прадукцыя малых паліграфічных форм, невялікай тыражнасці і ў большасці сваёй невысокага ўзроўню паліграфічнага выканання.

З 2012 г. у НББ і іншых бібліятэках краіны рэалізаваны наступныя мультымедыйныя анлайнавыя праекты: «Класікі сусветнай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас: да 130-годдзя з дня нараджэння песняроў зямлі беларускай», «Віртуальнае падарожжа з Янкам Маўрам», «Вайна 1812 года ў гісторыі Беларусі», «Беларусь у Першай сусветнай вайне» і інш. Былі створаны зыходныя інфармацыйныя масівы (электронныя копіі кніг, рэпрадукцый, аўдыязапісаў; суправаджальныя фактаграфічныя і бібліяграфічныя матэрыялы і інш.) і прадстаўлены на партале НББ у якасці асобных тэматычных блокаў. Папаўненне рэсурсаў стала ажыццяўляецца на пастаяннай аснове, прычым у трохмоўным рэжыме (на беларускай, рускай і англійскай мовах). Стварэнне падобных віртуальных праектаў мае шэраг пераваг у параўнанні з падрыхтоўкай і выданнем як друкаванай, так і электроннай прадукцыі: аперыраванне, па сутнасці, неабмежаванымі аб'ёмамі інфармацыі, зняцце бар'ераў у яе выкарыстанні, беражлівы рэжым фарміравання масіваў (штодзённы, з магчымасцю карэкціроўкі матэрыялаў), значна шырэйшая карыстальніцкая аўдыторыя, больш істотны грамадскі рэзананс.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Бібліятэкі распрацоўваюць і менш маштабныя праекты – віртуальныя выставы і прэзентацыі, прысвечаныя юбілеям выдатных людзей Беларусі, свецкім і духоўным святам, знамянальным гістарычным датам. У апошні час яны рэалізуюцца часцей за ўсё ў фармаце слайд-шоу. Гэтыя праекты пабудаваны на мадэлюючых магчымасцях бібліяграфічнай інфармацыі, але іх немагчыма лічыць выключна бібліяграфічнымі (яны комплексныя – утрымліваюць розныя пласты інфармацыі, бібліяграфічную ў тым ліку). Бібліяграфічны блок таксама нельга адназначна аднесці да рэкамендацыйнага: ён заснаваны на максімальна поўным выяўленні матэрыялу і акцэнтаванні ўвагі на найбольш значным і выразным. Такім чынам рэалізуецца магчымасць папулярызацыі нацыянальнай культуры, гісторыі. Такія ж уласцівасці характэрны і для краязнаўчых БД, якія ствараюцца рэгіянальнымі бібліятэкамі, – «Прыдзвінскі край» (Віцебская абласная бібліятэка), «Памяць Міншчыны» (Мінская абласная бібліятэка), «Край мой – Магілёўшчына» (Магілёўскай абласная бібліятэка), краязнаўчыя электронныя інфармацыйныя рэсурсы Гомельскай абласной бібліятэкі і інш. [15]. Неабходна адзначыць гісторыка-культурную каштоўнасць гэтых масіваў інфармацыі: яны паказваюць адметнасць рэгіёнаў.

Такім чынам, на сучасным этапе развіцця беларуская бібліяграфія захавала сталасць арганізацыйных структур і лепшыя традыцыі стварэння інфармацыйнай прадукцыі, якія склаліся на папярэднім этапе. Ёй былі ўспрыняты сусветныя тэндэнцыі адлюстравання нацыянальнай інфармацыйна-дакументнай спадчыны і перадавыя методыка-тэхналагічныя дасягненні. Распрацавана аснова нацыянальнай нарматыўнай прававой базы бібліяграфічнай дзейнасці, створаны шэраг дакументаў нарматыўна-тэхналагічнага характару, якія рэгламентуюць асобныя бібліяграфічныя працэсы, прадукты і паслугі: тэхнічныя заданні і праекты на стварэнне АБІС, нацыянальнай БД аўтарытэтных запісаў, рэтраканверсіі картачных каталогаў і іншыя; палажэнні аб электронных каталогах, бібліяграфічных БД, сістэме карпаратыўнай каталагізацыі; нацыянальныя камунікатыўныя фарматы бібліяграфічных і аўтарытэтных запісаў, кіраўніцтва па іх ужыванні. Упершыню адміністрацыйна-тэрытарыяльныя дзяленні і гістарычная перыяды-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зацыя Беларусі былі ўведзены для выкарыстання ў табліцах УДК, а самі табліцы перакладзены на беларускую мову. Усталяваны і актыўна развіваюцца міжнародныя сувязі, беларускія спецыялісты прадстаўляюць краіну ў шэрагу міжнародных арганізацый і праектаў, у тым ліку і тых, якія цалкам або часткова тычацца бібліяграфічнай дзейнасці. Пашыраецца міжнароднае супрацоўніцтва і рэалізацыя розных сумесных праектаў. Прафесійныя кантакты і сумесная праца дазваляюць адаптаваць лепшы міжнародны вопыт да нацыянальных рэалій. Перспектывы развіцця беларускай бібліяграфіі звязаны, на наш погляд, з далейшымі арганізацыйнымі пераўтварэннямі і замацаваннем за НББ функцый нацыянальнага бібліяграфічнага агенцтва; развіццём сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі ў краіне і каардынацыяй дзейнасці з бібліятэкамі і кансорцыумамі іншых краін свету; інтэнсіўнай рэалізацыяй Праграмы развіцця нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, каардынацыяй намаганняў буйнейшых бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў краіны для паспяховага яе выканання; упарадкаваннем прымянення ў межах краіны лінгвістычных сродкаў прадстаўлення інфармацыі ў інфармацыйна-пошукавых сістэмах і развіццём іх метадычнага суправаджэння; вызначэннем прыярытэтаў у фарміраванні крыніц навукова-дапаможнай бібліяграфіі ў краіне ў цэлым і намаганнямі па забеспячэнні такой прадукцыяй нацыянальнай гістарычнай навукі, культуры, мастацтва; далейшым развіццём віртуальных сэрвісаў і значным пашырэннем спектра аналітыка-інфармацыйных матэрыялаў для якаснага бібліяграфічнага суправаджэння суб'ектаў нацыянальнай навуковай і адукацыйнай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЛІТАРАТУРА

1. **Адамович, В. С.** Библиографическая деятельность государственной библиотеки БССР им. В. И. Ленина и Книжной палаты БССР за 50 лет / В. С. Адамович, Н. Б. Ватаци // 50-летие образования СССР и развитие библиотечного дела в Белоруссии : сб. науч. работ / Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина ; [ред. А. П. Демченкова]. – Минск, 1973. – С. 100–119 ; **Лявончыкаў, В. Е.** Беларуская бібліяграфія : агул. курс : падручнік па спец. «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / В. Е. Лявончыкаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1991. – 262 с. ; **Лявончыкаў, В. Е.**

Беларуская рэтраспектыўная бібліяграфія кніг / В. Е. Лявончыкаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1971. – 72 с. ; **Отраслевые** библиографии БССР / Л. Г. Амелькович [и др.] ; под общ. ред. В. А. Фокеева, Н. В. Иванова. – Минск : Вышэйшая школа, 1979. – 191, [1] с. ; **Прылішч, І. А.** Беларуская культура і бібліяграфія / І. А. Прылішч // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі «Беларуская бібліяграфія як частка нацыянальнай культуры», Мінск, 25–26 мая 1990 г. / рэдкал.: В. Я. Лявончыкаў [і інш.]. – Мінск, 1991. – С. 3–10 ; **Саітава, В. І.** Бібліяграфія на беларускіх землях як частка інфармацыйных працэсаў у другой палове XV – XVIII ст. / В. І. Саітава, Т. В. Страмужэўская // Здабыткі : дакумент. помнікі на Беларусі : зборнік / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2007. – Вып. 9. – С. 25–40 ; **Саітава, В. І.** Сусветная гісторыя бібліяграфіі (да сярэдзіны XX ст.) : вучэб. дапам. / В. І. Саітава. – Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, 2005. – 129 с. ; **Симановский, И. Б.** Белорусская советская библиография / И. Б. Симановский ; Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина, Кн. палата БССР ; [ред.: В. С. Григорьев, А. П. Демченкова]. – Минск, 1965. – Ч. 1. – 195 с.

2. **Агляды** па развіцці асобных бібліяграфічных кірункаў у выданнях: Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі : дзярж. бібліягр. паказ. / М-ва інфарм. Рэсп. Беларусь, Нац. кн. палата Беларусі ; [адк. рэд. І. А. Хмялеўская]. – Мінск : Нацыянальная кніжная палата Беларусі, 2006. – 64 с. ; **Березкина, Н. Ю.** Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси / Н. Ю. Березкина, Л. А. Авгуль, Б. Б. Невский ; Нац. акад. наук Беларуси. Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа. – Минск : Красико-Принт, 2002. – 143 с. ; **Кузьмініч, Т. В.** Гісторыя беларускай бібліяграфіі як кірунак сучаснага бібліяграфазнаўства: здабыткі і перспектывы / Т. В. Кузьмініч, В. І Саітава // Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і сацыяльная значнасць бібліятэк : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29–30 кастр. 2003 г. / [склад. Л. Г. Кірухіна ; рэдкал.: Р. С. Матульскі і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 42–46 ; **Кузьмініч, Т. В.** Практыка арыентаваны ракурс развіцця бібліяграфіі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі / Т. В. Кузьмініч // Материалы VI Международных книговедческих чтений «Библиотеки в формировании инновационной среды для развития науки, образования и бизнеса», Минск, 27–29 окт. 2010 г. / сост. Л. Г. Кирюхина ; науч. ред. Р. С. Мотульский. – Минск, 2010. – С. 327–335 ; **Предеина, А. В.** Краеведческая библиографическая деятельность областных универсальных научных библиотек Беларуси: история и теоретико-методические проблемы : дис. ... канд. пед. наук : 05.25.03 : 22.02.2000 : 07.06.2000 / А. В. Предеина ; М-во культуры Респ. Беларусь, Бел. ун-т культуры. – Минск, 2000. – 198 с ; **Ровина, Р. А.** Развитие информационно-библио-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графических ресурсов научно-технической и медицинской сферы в Республике Беларусь (2001–2010) / Р. А. Ровина, В. А. Касап // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 28 лістап. 2013 г.) / [рэдкал.: Ю. П. Бондар (старш.) і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 216–221.

3. **Кузьмініч, Т. В.** Этапы развіцця беларускай бібліяграфіі ў кантэксце сусветных бібліяграфічных працэсаў / Т. В. Кузьмініч, В. І. Саітава // Здабыткі : дакумент. помнікі на Беларусі : зборнік / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2011. – Вып. 13. – С. 7–8.

4. Там жа. С. 32.

5. **Национальные** коммуникативные форматы BELMARC для библиографических и авторитетных данных [Электронный ресурс] : метод. материалы / Нац. б-ка Беларуси ; С. В. Ильина, А. В. Муравьева (отв. исполн.) [и др.]. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2006. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM) ; 12 см. – Систем. требования: Intel Pentium II/RAM 64/SVGA ; Windows 98. – Загл. с тит. экрана.

6. **Яцэвіч, М. А.** Карпаратыўныя бібліятэчныя сістэмы і іх роля ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў Беларусі / М. А. Яцэвіч // Информационное обеспечение науки Беларуси: прошлое, настоящее, будущее : сб. науч. ст. / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; [редкол.: Н. Ю. Березкина (отв. ред.) и др.]. – Минск : Красико-принт, 2003. – С. 51.

7. **Мотульский, Р. С.** Электронные информационные ресурсы библиотек Беларуси – эффективное средство обеспечения доступа пользователей к информации и знаниям / Мотульский Р. С. // Материалы VII Международных книговедческих чтений «Библиотеки и политика открытого доступа к информации и знаниям», Минск, 10–11 нояб. 2011 г. / [сост. Л. Г. Кирюхина ; науч. ред. Р. С. Мотульский]. – Минск, 2011. – С. 9–26.

8. **Кузьмініч, Т. В.** Этапы развіцця ... С. 61–64.

9. **Иванова, Е. В.** Национальная библиография Беларуси в международном контексте / Е. В. Иванова // Библиография. – 2005. – № 4. – С. 17–26.

10. **Чыгірова, Р. М.** Да пытання вызначэння зместу паняцця «нацыянальны дакумент» / Р. М. Чыгірова, А. В. Мураўёва, Т. І. Рошчына // Здабыткі : дакумент. помнікі на Беларусі : зборнік / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 1995. – С. 9–16.

11. **Кніга** Беларусі (1517–1917) = Книга Белоруссии (1517–1917) : звод. кат. / Дзярж. б-ка БССР імя У. І. Леніна, Беларус. Сав. Энцык. ; [склад.: Г. Я. Галенчанка, Т. В. Непарожная, Т. К. Радзевіч ; навук. рэд.: С. Х. Александровіч, Н. Б. Ватацы, І. П. Хаўратовіч]. – Мінск : БелСЭ, 1986. – 614, [1] с., [12] л. іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. **Кузьминич Т. В.** Динамическая модель национальной библиографии Беларуси / Т. В. Кузьминич, О. В. Лихимович, Е. П. Косинская. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2012. – 181 с. ; **Кузьмініч, Т. В.** Практыка арыентаваны ракурс … С. 327–335.

13. **Касап, В. А.** Інфармацыйныя рэсурсы навукова-тэхнічнай і медыцынскай сферы : вучэбна-метадыч. дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі па спец. 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) / В. А. Касап, Р. А. Ровіна ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2014. – С. 40–43.

14. **Агляды** па развіцці асобных … 64 с.

15. **Мотульский, Р. С.** Электронные информационные ресурсы … С. 22.

*Представлен современный этап развития белорусской библиографии как национального библиографического комплекса. Показываются деятельность отдельных организационных структур, особенности функционирования разных видов библиографии, подходы к созданию библиографической продукции. В качестве положительных тенденций определены разработка национальной нормативной правовой, технологической і методической базы библиографической деятельности, развитие отечественных корпоративных проектов, виртуальных ресурсов и сервисов, международное сотрудничество и адаптация лучшего международного опыта к национальным реалиям.*

*The article presents the up-to-date period of the development of Belarusian bibliography as national bibliographic complex. It reveals the activity of separate institutions, function peculiarities of different kinds of bibliography, approaches to creation of bibliographic production. Marked out as positive tendencies are: treating of national norm legal, technologic and methodic base of bibliographic activity, development of native corporative projects, growth of virtual resources and services, international collaboration and adaptation of the best international experience to national reality.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ